# БЕЛАРУСКАЯ МОВА ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

Беларуская мова ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі – гэта вучэбны прадмет, пры вывучэнні якога школьнікі атрымліваюць сістэму навуковых ведаў пра сучасную беларускую літаратурную мову, яе асноўныя фанетычныя асаблівасці, лексічны склад, граматычны лад, фарміруюць уменні і навыкі (вучэбна-моўныя, маўленчыя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя) практычнага валодання беларускай мовай як сродкам зносін і пазнання рэчаіснасці, формай выражэння мыслення.

Значэнне вучэбнага прадмета «Беларуская мова», мэта і задачы яго вывучэння, асноўныя тэарэтычныя падыходы да навучання, крытэрыі адбору зместу навучання, характарыстыка зместу навучання па ступенях навучання раскрыты ў Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская мова». Звернем увагу на асноўныя яе палажэнні.

Беларуская мова як мова тытульнай нацыі і дзяржаўная мова Рэспублікі Беларусь адыгрывае важную ролю ў самасвядомасці беларускага народа, з'яўляецца крыніцай і сродкам пазнання і захавання нацыянальнай культуры. Працэс навучання беларускай мове садзейнічае развіццю поглядаў і перакананняў вучняў, выхаванню ў іх патрыятызму і грамадзянскасці, станоўчых маральна-этычных якасцей.

Развіццёвае і выхаваўчае значэнне вучэбнага прадмета «Беларуская мова» акрэсліваецца функцыямі, якія адыгрывае мова ў жыцці грамадства: камунікатыўнай (выступае як асноўны сродак зносін), кагнітыўнай (з'яўляецца інструментам пазнання рэчаіснасці), кумулятыўнай (захоўвае інфармацыю пра каштоўнасці беларускага народа, сацыяльны вопыт чалавецтва) і інш.

Беларуская мова як вучэбны прадмет займае адно з асноўных месцаў у сістэме адукацыі. Ва ўстановах з беларускай мовай навучання яна з'яўляецца не толькі аб'ектам вывучэння, але і сродкам навучання іншым прадметам, садзейнічае развіццю і выхаванню вучняў, далучэнню іх да каштоўнасцей нацыянальнай і сусветнай культуры.

Асноўная мэта моўнай адукацыі заключаецца ў тым, каб сфарміраваць сродкамі вучэбнага прадмета такога носьбіта мовы, які свядома і крытычна ўспрымае пачутае, асэнсавана чытае, граматна піша, правільна гаворыць, разумее моўныя з'явы і заканамернасці, валодае маўленчай этыкай і культурай.

Рэалізацыя гэтай мэты адбываецца на ўсіх ступенях навучання беларускай мове. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі (1 — 4 класы) вучні аваладваюць мовай як сродкам зносін ў працэсе фарміравання навыкаў маўленчай дзейнасці на аснове асэнсавання элементарных лінгвістычных ведаў, адбываецца інтэлектуальнае развіццё школьнікаў сродкамі вучэбнага прадмета, выхаванне нацыянальнай свядомасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі (5 — 9 класы) прадугледжваецца:

1) засваенне вучнямі сістэмы мовы, яе законаў, фактаў і з’яў, нормаў беларускай літаратурнай мовы, заканамернасцей і правілаў функцыянавання моўных сродкаў у маўленні (моўная кампетэнцыя);

2) фарміраванне на аснове авалодання маўленчай тэорыяй (тэкст, тыпы, стылі, жанры маўлення) уменняў самастойна ствараць вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (камунікатыўная кампетэнцыя);

3) усведамленне мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні (лінгвакультуралагічная кампетэнцыя);

4) развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, духоўна-маральнай, грамадзянскай культуры вучняў.

Навучанне беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (10 — 11 класы) павінна садзейнічаць у першую чаргу сістэматызацыі і паглыбленню ведаў, удасканаленню ўменняў і навыкаў, набытых у папярэднія гады, развіццю інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў.

Навучанне беларускай мове ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі абумоўлена практычнай накіраванасцю і зарыентавана на рэалізацыю кампетэнтнаснага, сістэмна-функцыянальнага, камунікатыўна-дзейнаснага і лінгвакультуралагічнага падыходаў пры выкладанні ўсіх тэм і раздзелаў.

Адбор зместу навучання беларускай мове адбываецца ў адпаведнасці з наступнымі крытэрыямі:

1) цэласнага адлюстравання ў змесце навучання мэты моўнай адукацыі;

2) навуковай і практычнай значнасці моўнага матэрыялу;

3) адпаведнасці складанасці зместу рэальным вучэбным і ўзроставапсіхалагічным магчымасцям школьнікаў;

4) адпаведнасці аб’ёму зместу навучання наяўнаму часу, які адводзіцца на дадзены прадмет згодна з вучэбным планам.

Асноўнымі прынцыпамі адбору зместу навучання беларускай мове з’яўляюцца сістэмна-функцыянальны, мінімізацыі моўнага і маўленчага матэрыялу, камунікатыўна-маўленчы і інш.

Сістэмна-функцыянальны прынцып прадугледжвае цэласнае адлюстраванне ў змесце навучання ўсіх узроўняў моўнай сістэмы і характарыстыку фунцыянальных магчымасцей моўных адзінак кожнага ўзроўню. Прынцып мінімізацыі моўнага і маўленчага матэрыялу абумоўлівае адбор матэрыялу з улікам яго значнасці для дасягнення мэт і задач моўнай адукацыі. Камунікатыўна-маўленчы прынцып прадугледжвае забеспячэнне вучэбнага працэсу адпаведным зместам для авалодання вучнямі ўсімі відамі маўленчай дзейнасці.

Курс беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі складаецца з трох узаемазвязаных этапаў, якія адпавядаюць тром ступеням

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адукацыі і па змесце і мэтах навучання дапаўняюць адзін аднаго. Адбор зместу моўнага і маўленчага матэрыялу, яго структураванне выкананы пераважна па лінейным прынцыпе, што дазваляе забяспечыць засваенне вучнямі моўных адзінак у іх узаемасувязі і лагічнай паслядоўнасці як цэласнай сістэмы, асэнсаванне семантычных, фармальных і функцыянальных прымет кожнага яе элемента.

Змест курса беларускай мовы на II ступені навучання складаецца з дзвюх частак: падрыхтоўчай і асноўнай (сістэматычнай). Падрыхтоўчая частка ў 5 класе ўключае 2 раздзелы: «Паўтарэнне вывучанага ў I — IV класах» і «Сінтаксіс і пунктуацыя». У асноўную частку ў 5 — 9 класах уваходзяць наступныя раздзелы: «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія», «Лексіка. Фразеалогія», «Словаўтварэнне і арфаграфія», «Марфалогія і арфаграфія»,«Сінтаксіс і пунктуацыя». Развіццё маўлення як састаўная частка моўнай адукацыі асобным раздзелам не выдзяляецца. Гэта абумоўлена тым, што навучанне звязнаму маўленню і практычнай маўленчай дзейнасці неабходна праводзіць пры засваенні ўсіх раздзелаў і тэм школьнага курса беларускай мовы. Спецыяльныя ўступныя тэмы, з якіх пачынаецца курс беларускай мовы ў кожным класе («Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа», «Валоданне літаратурнай мовай — асноўны паказчык культуры чалавека» і іншыя), накіраваны на фарміраванне лінгвістычнага светапогляду вучняў.

Засваенне беларускай мовы на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца на базавым і павышаным узроўнях. Змест навучання ў 10-м класе складаюць наступныя раздзелы: «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства», «Маўленне», «Тэкст», «Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія. Культура маўлення», «Лексіка. Фразеалогія. Культура маўлення», «Марфемная будова слова. Культура маўлення», «Марфалогія і арфаграфія. Культура маўлення». У 11-м класе вывучаюцца раздзелы «Маўленне», «Стылістыка», «Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення».

*У.П. Саўко.*

*Саўко, У. П. Беларуская мова ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі / У. П. Саўко // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў. У 12 т. Т. 7 Беларуская мова. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017. – С. 51–52.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ